3. Валиахметова, Г. Н. Особенности интеграции Турции в китайскую инициативу «Один пояс – один путь» / Г. Н. Валиахметова, М. А. Герман // Научный диалог. – 2020. – № 2. – С. 322–332.

4. Флегентова, А. А. Ближневосточный вектор внешней политики КНР (на примере китайско-турецких отношений) / А. А. Флегентова // Актуальные проблемы международных отношений. – 2017. – С. 137–142.

5. Аватков, В. А. Китайско-турецкие отношения в «Новую эпоху» / В. А. Аватков, П. А. Прилепский // Вестник Волгоградского государственного университета. Серия 4. История. Регионоведение. Международные отношения. – 2022. – Т. 27. – № 1. – С. 186–197.

## Радавітасць у сістэме каштоўнасцей беларускай шляхты (першая палова XIX ст.)

*Пухцеева Л. С., магістрант БДУ,*
*навук. кір. Макарэвіч В. С., канд. гіст. навук, дац.*

Шляхецкая ідэнтыфікацыя грунтавалася на шэрагу элементаў, адным з якіх было паходжанне. Менавіта яно дазваляла прадстаўнікам саслоўя падзяліць людзей на «сваіх» і «чужых». Атаясамленне з шляхецкім саслоўем на аснове ўяўлення аб атрыманні ў спадчыну крыві з’яўляецца фактарам, які садзейнічаў інтэграцыі групы і адлучаў яе ад іншых [1, с. 104]. У якасці прыкладу тут можна прывесці зварот «пане браце», які ў спалучэнні з прынцыпам шляхецкай роўнасці, верагодна, падкрэсліваў своеасаблівае сваяцтва ўсіх прадстаўнікоў саслоўя.

Для набілітэту паняцце «шляхецтва» ўяўлялася лагічным толькі ў кантэксце роду [1, с. 105]. Дваранін – гэта член роду, які адрозніваецца пэўнымі якасцямі і вызначаным становішчам. Менавіта нараджэнне ў шляхецкай сям’і вызначала прыналежнасць да шляхецкага саслоўя. Аргументы аб натуральнай, біялагічнай перадачы прыналежнасці да групы не падлягалі ніякай праверцы і абмеркаванню. Зыходзячы з гэтага, выключнае месца ў сістэме саслоўных каштоўнасцей беларускага дваранства займала паняцце роду.

«Удалае» нараджэнне давала двараніну пэўны крэдыт сацыяльнага даверу (аднак, варта адзначыць, гэта не было тоесным безумоўнаму прынцыпу). Сучасныя даследчыкі ў гэтым кантэксце выкарыстоўваюць – за П’ерам Бурдзье – паняцце культурнага капіталу [2, с. 38].

Прадстаўнікі шляхецкага саслоўя выразна адчувалі сувязь мінулых і будучых пакаленняў. Выяўлялася яна ў тым, што асобна ўзяты чалавек апынаўся як бы паміж двума пакаленнямі – былымі і будучымі – гэта азначае, што чалавек павінен быў, з аднаго боку, клапаціцца пра тое, каб не аддаліцца ад продкаў, захоўваючы сямейную гісторыю, а з другога, – неабходна было

захаваць і перадаць нашчадкам культурную спадчыну сям'і такой, якой яна была пры продках. Акрамя гэтага, шляхціц сваімі ўчынкамі павінен быў прымножыць «культурны капітал», які пяройдзе ўжо яго нашчадкам.

Уяўленне пра родавую годнасць аказвала ўплыў на паводзіны індывіда ў шляхецкім грамадстве. Акрамя таго, прыналежнасць да таго ці іншага роду ў шляхецкім асяроддзі была, па сутнасці, своеасаблівай візітоўкай чалавека – у залежнасці ад гэтага выбудоўвалася стаўленне астатніх прадстаўнікоў саслоўя да яго. Так, напрыклад, пан Суддзя выказвае сваю незадаволенасць у сувязі са з'яўленнем «новых парадкаў»:

Сягоння чалавека не пытай аб родзе:
Хто ён? Дзе жыў? Ці што рабіў? Па новай модзе,
Абы не шпег ды не ў рыззі, дык кожны прыме
Яго цяпер. Як той Веспазіян у Рыме,
Не нюхаў грошай, не пытаў аб іх крыніцы.
Вось так і родам перасталі ганарыцца… [3, с. 19].

Для шляхты было характэрна ганарыцца сваёй прыналежнасцю да нейкага роду, і гэтая ганарлівасць падштурхоўвала яе прадстаўнікоў працаваць на яго карысць; што заўзята абаранялася ад любых замахаў і ўсяляк дэманстравалася. Так, у інтэр'еры шляхецкіх сядзіб прысутнічалі шматлікія атрыбуты роду – родавыя гербы, партрэты продкаў і інш. – якія павінны былі як падкрэсліць прыналежнасць да роду, так і паказаць яго славу і старажытнасць. Таксама складваліся генеалагічныя дрэвы. Напрыклад, сямейнае дрэва ўзгадвае ў сваіх мемуарах Е. Фялінская [4, с. 12]. Асаблівую гордасць паходжаннем са старажытнага роду адчувала дробная шляхта. Гэта давала ёй адчуванне самапавагі і перавагі ў адносінах да іншых (прадстаўнікоў непрывілеяваных груп) [2, с. 44].

Такім чынам, радавітасць з'яўлялася вельмі важнай каштоўнасцю мясцовага дваранства, у першую чаргу па прычыне таго, што прыналежнасць да шляхецкага роду азначала тое ж, што і прыналежнасць да прывілеяванага саслоўя. Радавітасць вызначала паводзіны набілітэту, з'яўлялася важным элементам у падзеле на «сваіх» і «чужых», інтэграцыі саслоўя, падтрымлівала пачуццё ўласнай перавагі.

### Літаратура


1. Sawaniewska-Mochowa, Z. Dziedzictwo kultury szlacheckiej na byłych Kresach północno-wschodnich Rzeczypospolitej. Ginąca część kultury europejskiej / Z. Sawaniewska-Mochowa, A. Zielińska // Instytut Slawistyki PAN. – Warszawa, 2007. – 473 s.

2. Kotowicz-Borowy, I. Znaczenie tradycji etosu szlacheckiego w poczuciu tożsamości grupowej i narodowej na dawnych pograniczach Rzeczypospolitej /

I. Kotowicz-Borowy // Pogranicze. Studia Społeczne, T. XIX. – Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2012. – S. 33–59.
3. Міцкевіч, А. Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве: шляхецкая гісторыя з 1811 і 1812 гг. у дванаццаці кнігах вершам: [эпічная паэма] / Адам Міцкевіч. – Мінск : Попурри, 2019. – 383 с.
4. Felińska, E. Pamiętniki z życia Ewy Felińskiej. T. 1. – Wilno, 1856. – 420 c.

# Деятельность постаковских организаций на территории Щучинского района Гродненской области БССР в первые послевоенные годы (по публикациям газеты «Гродненская правда»)

*Розмысл Е. В., студ. III к. ГрГУ им. Я. Купалы,*
*науч. рук. проф. Ярмусик Э. С., д-р ист. наук, проф.*

Армия Крайова (далее – АК) – общее название военизированных формирований, созданных польским эмигрантским правительством в Лондоне после разгрома нацисткой Германией Польши в сентябре 1939 г. Основной целью данной организации было освобождение Польши от захватчиков (к таковым причисляли как Германию, так и Советский Союз), и ее восстановление в границах до 1 сентября 1939 г. В течение всего периода войны АК воевала как против немцев, так и советской власти, что продолжалось до января 1945 г., когда отряды АК официально были распущены. Вопрос послевоенных границ Польши был решен на Ялтинской конференции 3–11 февраля 1945 г., в результате установилась современная западная граница Беларуси. Если большинство участников польских вооруженных формирований смирились с изменением послевоенных границ, то некоторые бывшие члены АК – фанатики, известные как «белополяки», продолжили борьбу с советской властью в западных областях Беларуси. Постепенно их «борьба» за польскую национальную идею переросла в терроризм, за что в Польше их назвали «проклятыми солдатами» [4].

В Щучинском и Лидском районах Гродненской области польское националистическое подполье приобрело наибольший размах. После ликвидации батальонов «Рагнара» и «Крыси» уцелевшие отряды объединились в «Обвуд 49/67» под командованием Анатоля Радзивоника по кличке «Олех» [7].

Первая кровь пролилась уже после победы – летом 1945 г. Жертвой стала дочь председателя Щучинского сельсовета Александра Игнатьевича Савчука Екатерина, которая осталась ночевать у отца, когда принесла ему продукты от бабушки. Савчук снимал дом в Щучине с секретарем сельского Совета. Они оба получали письменные угрозы от неизвестных, поэтому и жили вместе. Вечером